КРЫВІНКА

ІНФАРМАЦЫЙНА-КУЛЬТУРНАЯ ГАЗЕТА БЕШАНКОВІЦКАГА РАЁНА

ЛІСТАПАД
№ 10 (37)
2008 год

"Нельга есці хлеб народа і грэбаваць ягонай мовай".
Ул. Караткевіч.

Народ сцерпіць усё

Калі я напрыканцы кастрычніка наведаў Менск, то мяне прыемна ўразілі цэны ў мінскіх дзяржаўных крамах – усе яны былі значна ніжэй за цэны нашага дзяржгандлю. Пачынаючы ад хлеба і заканчваючы малазначнай дробяззю -- усё каштавала танней. Дзе на паўтысячы, а дзе на цэлую тысячу, а на мясных пардуктах і болей.

Чаму так адбываецца ў нашай краіне, дзе па тэлевізару аб'яўляецца адно, а на справе – зусім іншае? Чаму бедныя павінны бяднець, а багатыя багацець? Хаця багатымі жыхароў сталіцы называць не зусім правільна, дакладней, багацейшыя. Тым не менш, вядома, што даходы, магчымасць знайсці прыстойнае месца працы, сам узровень жыцця ў Менску значна вышэйшыя.

Адказ напрошваецца такі. У сталіцы ўлада баіцца выклікаць у народа незадавальненне сваімі дзеяннямі, баіцца абвастрыць сітуацыю, баіцца сацыяльных хваляванняў. У нас жа ёй можна не хвалявацца: народ сцерпіць усё.

ВАКОЛ ВАДЫ

Вядома, што без вады і не туды, і не сюды. У нашым жа райцэнтры, нягледзечы на вялікія сродкі, затрачаныя на запуск станцыі абезжалезьвання, пытанне забяспячэння насельніцтва якаснай вадой не вырашана і стала сапраўднай праблемай.

Вось якія думкі былі выказаны работнікамі адной з арганізацый нашага раёна наконт воднага пытання.

– Раней вада ў кранах была зусім страшная, сёння яна ўжо лепшая.

– А я хачу набраць гэтай "лепшай" вады і адправіць у "Времечко", няхай, калі не пасмакуюць, то хоць паглядзяць на яе.

– А ў "Зары" пісалі, што станцыя абезжалезьвання ўжо працуе. Калі вада ідзе брудная, трэба проста прамыць трубы.

– Я жыву па вуліцы Дароўскага. Трубы тут ляжаць поліэтыленавыя, і стан вады ўжо колькі гадоў задавальняючы.

– Але найлепш ваду для піцця прывозіць з крыніцы, што за райбальніцай, на беразе Крывінкі.

– А калі ты хочаш піць чыстую ваду з-пад крана, купі фільтр за 120 000 рублёў і цэлы месяц будзеш піць добрую ваду.

Да размовы падключыліся жыхары Драздоў.

– А ў нашых кватэрах вада з-пад кранаў цячэ наогул смярдзючая і іржавая, а калі пастаіць суткі, то становіцца чорнай. Падобна на тое, што ваду, якая са свідравіны ідзе проста ў кран, ніхто не ачышчае. На ліст, які жыхары вёскі накіравалі ў "Водаканал", адказу не дачакаліся.

А "Крывінка" можа толькі дадаць, што мясцовыя ўлады водная праблема, як і дзесяткі іншых, абсалютна не турбуе. Відаць, зарплаты на мінералку ў адказных работнікаў хапае, а людзі – патрываюць.

Савецкая завядзёнія жыве!

Цёплае кастрычніцкае надвор'е дазволіла быўшым калгасам расцягнуць уборку ільну да самага канца месяца, хаця рызыка пусціць яго пад снег была. На апошнім тыдні кастрычніка на гэту работу зноў было знята мноства раённых арганізацый. Работнікі культуры, настаўнікі, прадстаўнікі іншых сфер – усе, моўчкі праклінаючы добрае надвор'е і дрэннае начальства, грузіліся ў аўтобусы і ехалі на калгасныя нівы. Рэйсавыя ж аўтобусы амаль поўнасцю былі зняты з маршрутаў, што прыводзіла да хаосу і неразбярыхі для тых, хто планаваў у гэты дзень нешта іншае, чым дапамога калгасам.

Такая завядзёнка жыве са слаўных савецкіх часоў, калі не было яшчэ на ўзбраенні калгасаў адпаведнай тэхнікі. Але і праз 17 гадоў пасля знікнення Савецкага Саюза у незалежнай Беларусі ўсё засталося па-ранейшаму, і поўнасцю залежыць ад волі начальства. Народная мудрасць ведае: "Калі я – начальнік, то ты – дурань."

Колькі яшчэ будзе цягнуцца такая сітуацыя, можна адказаць вельмі дакладна: пакуль будзе існаваць гэта ўлада. Менавіта датуль будуць адчуваць сябе дурнямі большасць людзей з бюджэтных раённых арганізацый, якіх начальнікі прымушаюць бясплатна рабіць самую чорную работу. У новай, безкалгаснай Беларусі, дзе знойдзецца месца сапраўдным гаспадарам зямлі, такога беззаконня быць не можа.

Хацелася б адзначыць яшчэ, што нягледзечы на дармавую рабочую сілу, якую былыя калгасы маюць круглы год, і на рэкордныя ўраджаі, цана на хлеб у сённяшняй Беларусі працягвае імкліва ўздымацца.

Безадказнасць і абыякавасць

Трапіў выпадкова на вуліцу імя Ткачэнкі – і ледзь не страціў прытомнасць: усё скрозь перакапана і абы-як зараўняна. Пакуль што тут суха, але ж падзеі адбываюцца глыбокай восенню, а значыць людзям прыйдзецца тут мясіць гразь ці не да чэрвеня наступнага года.

Што не дазваляе камунгасу праводзіць земляныя работы ў сухі перыяд года, чаму на месца парушанага асфальту адразу не ложыцца новы, хто плануе ўсе работы па райцэнтру на працягу года – гэтыя пытанні застаюцца без адказаў не ўпершыню. Здаецца, што ўсё робіцца знарок, для таго, каб чарговы раз выпрабаваць людское цярпенне.

Яшчэ і яшчэ раз наша ўлада даказвае, што ўзятая ноша ёй не пад сілу. Нават у адным асобна ўзятым маленькім горадзе збіраецца столькі праблем, што той форме раённых арганізацый, якія існуюць сёння, яўна не пад сілу іх вырашыць.

Радыус закруглення

Ці звярнулі вы ўвагу на тое, што там, дзе перасякаюцца дзве дарогі, галоўная і другарадная, мноства ямін. Прычым усе яны знаходзяцца не на галоўнай, а на другарадной дарозе перад самым скрыжаваннем. Ёсць нават спецыяльны тэрмін, які назыве такую зону з ямкамі – радыюс закруглення.

На гэтым перасячэнні той, хто абслугоўвае галоўную дарогу, мусіць абслугоўваць і радыюс закруглення, то бок з'езд з галоўнай дарогі. Але, як правіла, ён застаецца беспрызорным, пакінутым. Ён як бы нічыйны, бо ляжыць трошкі ўбаку ад галоўнай дарогі, на другараднай, але належыць да галоўнай. Вось таму, што ён ляжыць крыху ўбаку, ніхто яго зазвычай не абслугоўвае. Зімой ён расчышчаецца ў апошнюю чаргу, а ў самыя снегапады застаецца некранутым, так што аўтамабіль часта трапляе тут у аварыйную сітуацыю. Не лепей сітуацыя на радыюсе закруглення і ўлетку. Калі ты на павароце не скінеш хуткасць да мінімуму, то рызыкуеш не толькі паломкай аўтамабіля. З ямкі цябе можна лёгка выкінуць на паласу сустрэчнага руху, і пазбегнуць сутыкнення можна будзе хіба што толькі пры адсутнасці сустрэчнага транспарту.

Хто ж заасфальтуе тыя ямкі на радыюсе і калі? Пэўна, калі нехта сапраўды трапіць у аварыю і зможа даказаць, што віной таму – стан дарогі.

Цытата

Рану, нанесеную Радзіме, кожны з нас адчувае ў глыбіні свайго сэрца.

Віктар Гюго

СІНЯЎКА

Восень скончыла песьні раптоўна:
Была -- і няма.
Не шкадуйце мяне,
Мне не трэба казённай спагады.
Сівер з поўначы ноччу падзьмуў:
Прывітаньне, зіма!
Першы раз у жыцьці
Я твайму надыходу ня рады.

Барсуком закапацца ў нару
Так ахвоціцца мне,
Каб ад жаху начэй ледзяных
Не спынілася сэрца,
Каб ва ўтульным куточку
Паціху пахрапваць у сьне,
А вясною ласкавай
На сонейка выйсьці пагрэцца.

Тут знаёмых сустрэць барсукоў,
Хто таксама, як я,
Пераседзеў у норках
Ліхое нашэсьце-навалу.
І трапечацца сэрца маё,
Быццам у вераб'я.
Раптам чую: сінічка
Адна за акенцам сьпявае.

І за думкі свае
Ахапіў мяне сорам такі!
Гэта птушачка мне
Запаліла надзеі газьнічку.
У напевах яе
Чуцен голос вясны трапяткі.
Стогны злых завірух
Не спужалі маленькай сінічкі.

Рана лезьці ў нару
І чакаць, калі вернецца май.
Калі нават згарым,
Быццам зь неба лятучыя зьнічкі,
Трэба жыць і упарта змагацца
За родны свой край.
А спатрэбіцца мужнасць --
Ня пойдзем прасіць у сінічкі.

Георгі Станкевіч.

АБ'ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Крывінка" паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску.

Рэдакцыя абвяшчае конкурс чытачоў "І такое бывае!". Удзельнікаў конкурсу чакаюць прызы, а пераможцу -- сюрпрыз! Матэрыялы дасылайце на адрас рэдакцыі. Апошні тэрмін – 31 снежня. Вынікі конкурсу будуць падведзены у першым навагоднім нумары.

Калі парушаны вашы правы спажыўца, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Крывінка".

АМЕРИКАНСКАЯ «ЦВЕТНАЯ» РЕВОЛЮЦИЯ

Прошедшие американские выборы вызвали небывалый ажиотаж как в самих США, так и в мире. Митинг в Чикаго с участием около 1 миллиона человек после избрания президентом Барака Обамы – это признак того, что общество сильно взбудоражено событием. Такие толпы людей обычно являются симптомом глубоких социальных стрессов.

Мировой интерес к нынешним американским выборам обусловлен несколькими причинами. Прежде всего, это следствие процесса глобализации. Мир становится все более единым и тесным, особенно благодаря современным СМИ. События в одной части земного шара становятся известными, интересными и важными для всего человечества. Тем более, если это избрание президента в самом мощном государстве мира.

Во-вторых, ажиотажу способствовал мировой финансовый кризис. Он начался в США, и здоровье американской экономики существенным образом влияет на экономическое выздоровление других стран. Например, от действий финансовых властей США зависит курс доллара, чем интересуются все люди, которые имеют эту валюту, даже если они далеки от политики.

В-третьих, необычность фигуры будущего американского президента. Избрание чернокожего Барака Обамы главой крупнейшего государства евроатлантической цивилизации – это культурный шок, ментальная революция не только для США, но и для мира. Соединенные Штаты создавались белыми протестантами, именно они заложили в основание нового социума те принципы и ценности, которые определили нынешнее место и роль этой страны в мире. Еще в 1960 году, когда женились родители Б. Обамы, брак между представителями разных рас считался уголовным преступлением более чем в половине американских штатов. И вот их сын становится президентом США, причем 2/3 проголосовавших за него были белыми американцами. Сбылась мечта Мартина Лютера Кинга. Избрание Б. Обамы символизирует скорость и масштаб изменений в мире и в самих Соединенных Штатах. Это своеобразная американская «цветная» революция, которая возбудила огромные, часто неоправданные надежды, и может привести к значительным изменениям во внутренней и внешней политике США.

Вполне закономерно, что главным тезисом избирательной кампании Б. Обамы стала идея перемен. Она оказалась воспринятой обществом не только по причине финансового кризиса, приведшего к тому, что свыше 1 млн американцев потеряли работу, но и из-за непопулярности действующего президента Дж. Буша. Он имеет самый низкий президентский рейтинг за многие десятилетия.

Белорусское телевидение поспешило заявить, что причина победы Б. Обамы обусловлена недовольством американцев агрессивной внешней политикой администрации Дж. Буша. На наш взгляд, проблема не в агрессивности, а в неэффективности. США надолго застряли в Ираке и Афганистане, не могут обуздать ядерные амбиции Ирана и Северной Кореи, все это сопровождается обострением разногласий между Соединенными Штатами и Европой, Россией, ростом антиамериканских настроений в мире.

Понятно, что идея перемен в условиях кризиса получила массовую поддержку в американском обществе. Эта идея не могла отождествляться с Д. Маккейном. И потому, что он однопартиец непопулярного Д. Буша, и по причине возраста. Трудно было поверить, что назревшие изменения в стране может осуществить выдвиженец Республиканской партии.

Идея перемен требовала новой фигуры, нового лица в прямом и переносном смысле. И Б. Обама, как это обычно бывает в истории, оказался в нужное время в нужном месте. Плюс, безусловно, талант политика, способность к коммуникации, ораторское мастерство.

Хотя между США и Беларусью существуют огромные различия, однако некоторые уроки американских выборов можно спроецировать на будущую президентскую кампанию в нашей стране. Прежде всего, уже сегодня очевидно, что существенные коррективы в политическую жизнь страны внесет кризис. Его первые симптомы уже проявляются, но как предсказывают экономисты, самое трудное еще впереди. Как известно, главная идея, с которой А. Лукашенко апеллирует к обществу уже много лет – это идея стабильности. Во многом благодаря ей он обеспечивает свою легитимность. Но в условиях кризиса она будет терять свою политическую силу. Кризис и стабильность – понятия плохо сочетаемые.

Можно предположить, что в 2010 году идея перемен станет гораздо более привлекательной, чем сегодня. И она, как сейчас в США, может стать центральным лозунгом оппонентов нынешней власти.

Обратите внимание, что А. Лукашенко пытается играть на опережение. Он тоже объявил о переменах в экономической политике, отношениях с Европой. Но проблема в том, что его образ прочно и основательно привязан к идее стабильности, сохранения нынешней экономической и политической модели, социального статус-кво. И в его реформаторский образ народ не поверит. Слишком глубоко впечатался в сознание белорусов имидж А. Лукашенко как стабилизатора и охранителя существующей системы. Проводя параллели с США, это если бы приверженец консервативного фундаментализма Дж. Буш вдруг стал демократом-реформатором.

Поэтому если оппонент А. Лукашенко на президентских выборах возьмет на вооружение идею перемен, то он может иметь серьезный шанс получить значительную поддержку общества.

Опыт США показывает, что долгое пребывание у власти одного человека в наш динамичный век не дает ничего хорошего. Руководителей государств надо периодически менять. Таков закон политической природы.

Валерий Карбалевич,
“Свободные новости плюс” №45.

20 мільёнаў рублёў кампенсацыі

20 мільёнаў беларускіх рублёў,альбо больш за 9 тысяч даляраў – менавіта такую суму ў якасьці кампенсацыі маральнай шкоды патрабуе лекар Іван Шэга ад сяброў адной з участковых камісій Слонімскай выбарчай акругі.

Лекара слонімскага раённага шпіталя Івана Шэгу ў свой час здзівілі вынікі выбараў на адным з участкаў:па афіцыйных дадзеных, за яго кандыдатуру прагаласаваў толькі 21 выбаршчык, ці прыкладна 3% ад агульнай колькасьці.

Сябра партыі БНФ палічыў, што гэтага не можа быць і правёў пісьмовае апытанне выбарцаў з мэтай высветліць за каго яны аддалі свой голас. 70 чалавек пісьмова падцвердзілі, што галасавалі за Івана Шэгу, які лічыць дзеянні сяброў камісіі не чым іншым,як парушэннем крымінальнага кодэксу:

-Няма ніякага сумневу ў тым, што сябры камісіі парушылі крымінальны кодэкс-гэта засведчылі сваімі подпісамі 70 чалавек. Паводле адпаведнага артыкула, іх чакае турэмнае пакаранне тэрмінам да 5 гадоў. І тэрміну даўніны ў такіх справах няма.

Ужо дакладна вядома, што суд Слонімскага раёна прыняў справу да разгляду: 70 сведкаў спрабуюць даказаць,што парламенцкія выбары былі сфальсіфікаваныя. Мясцовая пракуратура ў свой час не знайшла парушэнняў ў працы ўчастковай камісіі. Свае высновы супрацоўнікі пракуратуры зрабілі на падставе апытання намесніка старшыні камісіі.

Радыё Рацыя.

«Молодые белорусы думают, что Куропаты — это в России»

Лариса МИХАЛЬЧУК, www.zautra.by

Двадцать лет назад известие об открытии массового захоронения жертв НКВД в Куропатах на окраине Минска вызвало настоящий информационный взрыв. Но с каждым годом память об этой трагедии тает. Молчание государства привело к тому, что молодые люди не знают, какую роль сыграло в истории Беларуси это страшное место.

— Когда я показал фильм о Куропатах студентам одного из вузов, интерес к событиям сразу же возник. Это как раз говорит о том, что именно отсутствие информации приводит к равнодушию. А когда человек увидел видеоряд с комментариями и представил, что это было, у него меняется восприятие истории. Наша молодежь сегодня лишена возможности знать об этих событиях, — считает Игорь Кузнецов. — А как они могут узнать о них в условиях практически полной информационной блокады? Даже негосударственная пресса ушла от этой темы. Про государственные СМИ я и не говорю. Это ошибочная позиция. Я который год слышу, что репрессии в целом и Куропаты в частности — это немодная тема. Но подобные темы — не одежда, которую по моде выбирают. Это связано с трагическими судьбами сотен тысяч наших сограждан. И я считаю, что подобные заявления имеют откровенно циничный характер. А потом появляются вопросы, почему у нас такое национальное сознание? Почему молодежь сегодня не знает и не хочет знать своей истории и никому не верит?

> «Я каждый год задаю студентам вопрос: «Что такое Куропаты?» Сегодня на него не смог ответить ни один человек! Кто-то сказал, что это, наверное, в России или Украине», — известный исследователь темы сталинских репрессий в Беларуси, историк Игорь Кузнецов анализирует, кому выгодно исчезновение памяти о трагедии Куропат.

Не поднимая тему репрессий, тему Куропат, мы наступим на те же грабли, на которые наступали всегда. Есть уроки истории, которые необходимо усваивать. Если же народ не помнит о тех жертвах, которые понесли предыдущие поколения, он не способен построить цивилизованное правовое государство. У такого народа нет будущего. И так всегда в истории было. Это не открытие сегодняшнего дня.

— Почему тему Куропат «замолчали»?

— Это абсолютно алогичные действия. В соседних государствах, в России и Украине, тоже есть проблемы, но там открыли архивы, сообщили фамилии расстрелянных, назвали места массовых расстрелов и захоронений, ученые работают по этой проблематике, выходят монографии, публикуются сборники документов, снимаются фильмы, которые и мы можем смотреть по российским каналам уже столько лет. То есть там совершенно другая картина. И на этом фоне мы — какой-то островок непонятной секретности. То, что творилось в Украине и РСФСР, происходило и здесь. Отличаются только количество расстрелянных и места захоронений.

Возникает вопрос: кому это выгодно? На этот вопрос я сегодня ответить не могу. Нынешние руководители государства не имеют никакого отношения к работникам НКВД, которые творили эти беззакония в 30 — 40-х годах прошлого века, и не состоят в родстве, что было бы хоть каким-то объяснением сложившейся ситуации. В том-то и вопрос, что непонятно, откуда это все исходит, кому и зачем это надо, когда столько лет прошло.

Давно надо было сказать правду, отдать дань уважения погибшим и поставить тем самым точку в этой многолетней истории. К сожалению, она не поставлена на сегодняшний день.

Тема репрессий в целом замалчивается в Беларуси. Ни в одном учебнике, изданном в Беларуси за последние 8 — 10 лет, даже не упоминаются Куропаты. Хотя бы одна фраза, что в 1988 году там было обнаружено захоронение и проведено следствие. Нет! И в целом о репрессиях в учебниках сейчас не говорится ничего или говорится примерно следующее: «Победила революция, у советской власти было очень много врагов, она боролась с ними всеми силами и средствами, в связи с чем необходимо было проводить репрессии. СССР — не исключение, многие страны проходили этот путь».

При этом нигде нет ни одной цифры, сколько же было репрессированных, сколько расстрелянных, сколько посажено в тюрьмы. Хотя бы для того, чтобы сказать, вот видите, сколько у нас врагов было... Зато в школьных и вузовских учебниках приводится дежурная фраза, которая и в советское время кое-где проскакивала, что в годы репрессий в основном пострадали работники партийных и советских органов и интеллигенция. Но это не соответствует действительности, потому что интеллигенция Беларуси в общем числе пострадавших составляет около 10%. В основном же репрессированы были рабочие, крестьяне и отдельные категории лиц, например священнослужители. Среди интеллигенции действительно были очень большие потери, но, например, в 1937 году в расстрельных списках было более 2/3 рабочих, колхозников, домохозяек, единоличников, безработных.

— А по вашим данным, сколько людей пострадало в Беларуси?

— Есть полуофициальная цифра, которую привел Владимир Адамушко в своей книге «Палітычныя рэпрэсіі 20 — 50-х гадоў на Беларусі», изданной в 1994 году. Он называет цифру около 600 тысяч человек. Но на государственном уровне никто официально не озвучил, сколько же людей было репрессировано в Беларуси.

Я просчитывал по разным источникам. По моим данным, количество репрессированных никак не меньше 1 миллиона и может доходить примерно до 1,5 миллиона человек. Причем речь идет о тех репрессиях, которые можно зафиксировать. А как быть с такого рода репрессиями, когда в школе на пионерской линейке клеймили позором того, у кого были арестованы родители как враги народа? Кого исключали или не принимали в комсомол или пионеры? Как быть с теми, кого увольняли или не принимали на работу, лишая права на труд, с теми, кого лишали избирательных прав? Это вообще не поддается исчислению.

— Как увековечивалась в Куропатах память жертв репрессий на протяжении всех двадцати лет после открытия захоронения?

— С 1989 года в Куропатах началось создание народного мемориала. Там каждый год ставились кресты, потом была создана «Крыжовая алея» в центре, установлены мемориальные знаки, установлены были еврейский камень в память погибших, польский крест, лавка Клинтона… Основная тяжесть работ легла на Белорусский народный фронт, а после его раскола — на Консервативно-христианскую партию БНФ. В увековечении памяти жертв репрессий принимали участие Ассоциация жертв репрессий, Минское общественное объединение «Дыярыуш», отдельные неравнодушные граждане.

Члены международного историко-правозащитного общества «Мемориал» установили пять мемориальных знаков на захоронениях, где в ходе эксгумаций 1988 и 1998 годов были обнаружены останки жертв.

Государство в 1989 году установило камень с мемориальной доской, на которой было написано, что на месте камня будет установлен памятник. Но больше государство ничего не сделало. С середины 1990-х годов события стали развиваться по печальному сценарию: если сначала акты вандализма были единичными, то после 1996 года вандалы в Куропатах активизировались, притом действовали довольно избирательно. В последние 10 лет десятки крестов были уничтожены, скамья Клинтона была не раз осквернена, «Крыж Пакуты», который стоял с 1988 года, дважды был поломан. Последние 10 лет Куропаты являются местом боя, по-другому не могу сказать. Одни люди созидают, другие уничтожают память о тех, кто погиб, и чьи останки здесь покоятся.

Пока хоть кто-то сюда будет приходить, память о невинно погибших людях будет жива. А если об этом будут писать, будет жива тема репрессий. Это дает надежду, что нынешняя молодежь не повторит ошибки своих дедов и прадедов.

Заснавальнік і рэдактар: Георгій Станкевіч

Адрас рэдакцыі: Бешанковіцкі раён, в. Старыя Ранчыцы, e-mail: stan62@tut.by. Тэл. 37455, маб. +375292184739

Наклад: 290 асобнікаў. Выдаецца пры падтрымцы сяброў. Распаўсюджваецца бясплатна